Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна -педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# ЗІМОВЫ  ЛЕС
(канспект экскурсіі)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Узрост дзяцей: 4-6 гадоў;

Тып маршруту: пешы

Працягласць па часе: 40 мін.

Адлегласць: 100 м.

Маршрут: дзіцячы сад – лес– дзіцячы сад

Мэта: пашыраць уяўленні дзяцей аб лесе ў зімовы перыяд, выхоўваць любоў да прыроды.

Праграмныя задачы: фарміраваць уяўленні аб зімовых зменах у прыродзе; развіваць назіральнасць, увагу, памяць, мысленне; выхоўваць сяброўскія ўзаемаадносіны, фарміраваць дзіцячую супольнасць.

Абсталяванне: план маршруту, насенне розных раслін і крупы для птушак, аптэчка.

Папярэдняя праца: гутарка з дзецьмі аб правілах паводзін у лесе.

Ход экскурсіі

Па дарозе ў лес. Звярнуць увагу дзяцей на сляды на снезе, абмеркаваць іх паходжанне. Падысці бліжэй да лесу, спыніцца у такім месцы, дзе лес добра бачны і добра праглядаецца яго яруснасць. Прапанаваць паглядзець на прыгажосць зімовага лесу і паслухаць верш.

Зімовы лес –
Крыштальны сад
У звоне промняў заінелых.
Сняжынак свеціцца пагляд
На галінках белых-белых.

Ліецца ціхае святло
Ў ранішнім спакою.
Яно паўнеба абняло
Ласкай незямною.

І ціш баяцца скалыхнуць
Вятры за небакраем.
І я баюся уздыхнуць –
Сэрца замірае.

Звярнуць увагу дзяцей на прыгажосць пейзажа, затым абмеркаваць розную вышыню дрэў - яруснасць лесу.

У лесе.

Звярнуць увагу на дрэвы і кусты, абмеркаваць з дзецьмі, чаму яны голыя, у якіх умовах яны зараз жывуць, чаго ім ва ўмовах не хапае. Разгледзець сасну і елку - толькі гэтыя дрэвы застаюцца зімой зялёныя, а таму самыя прыгожыя. Разгледзець іголкі гэтых дрэў - яны цвёрдыя, пакрытыя шчыльнай скуркай, ім не страшны мароз. Прапанаваць дзецям разгледзець і назваць дрэвы (па кары, галінках).

Прапанаваць кожнаму дзіцяці выбраць дрэва, падысці да яго і абняць, пагладзіць кару, пагрэць дыханнем, прыціснуцца шчакой, сказаць ласкавыя

словы: «Дрэўца, я табе вельмі спачуваю, я разумею, як табе холадна і цяжка зімой, я цябе крыху пагрэю, пацярпі - вясной і летам табе будзе вельмі добра!

Правесці з дзецьмі гутарку аб жывёлах лесу, іх жыцці на розных ярусах - паверхах. Чым яны харчуюцца ўзімку, якую афарбоўку меха набываюць у зімовы перыяд. Успомніць, як чалавек можа дапамагчы жывёлам і птушкам перазімаваць лютую зіму.

У лесе ж цяжка даводзіцца буйным жывёлам у перыяд, калі на снегу з'яўляецца цвёрдая скарынка - наст. Іх ногі правальваюцца пад наст, яны іх раняць, рэжуць вострым беражком наста, не могуць хутка ўцякаць ад драпежнікаў. Гэта такія жывёлы, як ласі, алені, зубры. Ляснікі падкормліваюць такіх жывёл хлебам і збожжавымі, насыпаюць ім на пні соль.

Звярнуць увагу дзяцей на снежнае покрыва, на мноства знакаў, якія ёсць на ім: сляды жывёл, насенне, якое абсыпалася з раслін, зламаныя галінкі, сучкі, шышкі.

На ўскрайку лесу.

Прапанаваць дзецям зрабіць жывую карцінку «Калі б я быў дрэвам…». Дзеці, падняўшы рукі ўверх, заміраюць на некалькі хвілін, уяўляючы, што яны каранямі ўраслі ў зямлю. Затым абмеркаваць, што яны адчувалі, будучы дрэвамі.

Развітаемся з лесам:

Лес дрымучы, да спаткання!<br>
Ты расці на радасць людзям!<br>
Мы сябраваць з табою будзем,<br>
Добры лес, магутны лес.

На зваротным шляху. Загадаць дзецям загадкі аб лесе, успомніць прымаўкі, прыказкі аб лесе.

У другой палове дня прапанаваць дзецям намаляваць свае ўражанні аб экскурсіі ў зімовы лес.